НОВАЕ Ў АДУКАЦЫІ



Людміла Яўгенаўна НІКАНАВА,
кандыдат педагагічных навук, дацэнт.
На выдатна закончыла факультэт дашкольнага выхавання МДПІ імя М. Горкага (1976 г.).
Працавала выхавальнікам, метадыстам у дзіцячым садзе. Закончыла аспірантуру, абараніла дысертацыю: «Выхаванне пачаткаў патрыятызму ў дзяцей старшага дашкольнага ўзросту». Выдала навучальна-метадычны дапаможнік «Патрыятычнае выхаванне старшых дашкольнікаў» (1990 г.),
прымала ўдзел у распрацоўцы праграмы «Праleска»,
у падрыхтоўцы навучальных дапаможнікаў для студэнтаў.

# СЯМЕЙНАЯ ПЕДАГОГІКА

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Увну прадугледжваецца вывучэнне новай дысцыпліны — «Сямейная педагогіка». Увядзенне гэтага курса не з'яўляецца выпадковым і звязана ў першую чаргу з прызнаннем асаблівай ролі і прыярытэту сямейнага выхавання ў развіцці дзіцяці. Лёс і шчасце дарослага чалавека ў многім вызначаецца тым, як яго выхоўвалі ў дзяцінстве. Менавіта таму розныя навукі ўзмацнілі сваю ўвагу да сям'і як аб'екта даследавання.

У задачы курса ўваходзіць:

- *дапамога педагогам ва ўсведамленні сацыяльнай каштоўнасці сям'і, спецыфікі і сутнасці сямейнага выхавання;*
- *садзейнічанне выхаванню педагагічна адукаваных бацькоў;*
- *фарміраванне ўмення эфектыўна будаваць работу з сям'ёй.*

Змест курса прадстаўлены трыма раздзеламі.

***У першым*** — «Сям'я — сацыяльны інстытут фарміравання асобы» — разглядаецца аб'ект, прадмет сямейнай педагогікі, яе крыніцы, задачы, метады і сувязь з іншымі навукамі. Інтарэс студэнтаў выклікаюць тэмы, у якіх даследуюцца генезіс і эвалюцыя сям'і ў гісторыі чалавецтва. Студэнты даведваюцца, што шлюб і сям'я ўзніклі ў розныя гістарычныя перыяды; што сям'я ўяўляе больш складаную сістэму зносін, чым шлюб; што сямейныя зносіны, якія ўзніклі ў развітым класавым грамадстве, істотна змяніліся; што ў сучасным свеце існуюць альтэрнатыўныя формы сям'і. За апошнія 50 гадоў адбылося столькі глабальных змен, якія тычацца ўзаемаадносін у сям'і, што іх проста немагчыма суаднесці з усімі пераменамі да гэтага часу. Разам з тым інстытут сям'і непахісны ва ўсіх краінах свету і сур'ёзнай альтэрнатывы яму няма.

Студэнты знаёмяцца з сучасным станам сям'і ў Беларусі. Вопыт паказвае, што інтарэс будучых педагогаў да гэтага пытання непадроблены, імкненне больш даведацца аб культуры і традыцыях выхавання ў беларусаў вельмі шчырае.

***Другі раздзел*** прысвечаны вывучэнню асноў сямейнага выхавання. Студэнты знаёмяцца з сямейным заканадаўствам, дзяржаўнай палітыкай у гэтай галіне. Вялікая ўвага ўдзяляецца знаёмству будучых педагогаў з новай парадыгмай адукацыі, вылучэнню на першы план гуманістычных арыенціраў і ідэй у сямейным выхаванні. Гэты падыход заключаецца ў тым, што бацькі павінны ўспрымаць дзіця як данасць, такім, які ён ёсць, з усімі асаблівасцямі, спецыфічнымі рысамі, звычкамі, нягледзячы ні на якія знешнія эталоны і ацэнкі.

Сур'ёзная ўвага ўдзяляецца праблеме суадносін любві і дысцыпліны ў сямейным выхаванні, захоўванню правоў дзяцей. Праблема ў тым, што для традыцыйнай і сучаснай практыкі сямейнага выхавання беларусаў характэрныя строгасць і бацькоўская аўтарытарнасць. Вялікая колькасць сучасных бацькоў разглядаюць у якасці асноўнага паказчыка паспяховасці выхавання дзіцяці яго паслухмянасць. Вучонымі і практыкамі адзначаецца дэфіцыт эмацыянальна насычаных адносін паміж бацькамі і дзіцем у сям'і, недастатковае праяўленне любві да дзіцяці. А яму больш за ўсё неабходна любоў бацькоў! Гэта жыццёвая неабходнасць.

Іншая, не менш значная праблема — абарона правоў дзіцяці ў сям'і, павага да яго годнасці. Вучоныя лічаць галоўнай балявой кропкай сучаснай адукацыі тое, што дзіця і дома, і ў дашкольнай установе знаходзіцца ў агрэсіўным, неўратычным асяроддзі. І таму карэкцыйныя намаганні педагогаў неабходна накіроўваць на змяненне адносін бацькоў да агрэсіўных паводзін увогуле.

***Трэці раздзел*** курса прысвечаны праблеме ўзаемаадносін дзіцячага сада і сям'і. Важнымі ўмовамі эфектыўнага супрацоўніцтва можна лічыць:

- *увядзенне сістэмнага маркетынгавага маніторынгу ў дзіцячым садзе;*
- *арганізацыю адаптацыйнага перыяду дзіцяці ў дзіцячым садзе, якая ўключае работу з бацькамі і дзіцем;*
- *вывучэнне педагогам сямейнага мікраасяроддзя;*
- *выкарыстанне новых тэхналогій;*
- *актыўнае ўключэнне бацькоў у перспектыўныя формы супрацоўніцтва і інш.*

Курс «Сямейная педагогіка» ўключае блок семінарскіх заняткаў.

На занятках ажыццяўляецца асобасна арыентаваны падыход да падрыхтоўкі педагога дашкольнай адукацыі. Студэнты самастойна выбіраюць праблемы для вывучэння.

Пэўны інтарэс, як паказвае вопыт, у студэнтаў выклікаюць заняткі, прысвечаныя праблемам параўнальнай педагогікі сям'і, дзе вывучаюцца погляды айчынных і замежных педагогаў на актуальныя тэмы сямейнага выхавання (агрэсіўнае дзіця, нервовае, упартае, непаслухмянае, адоранае; дзіцячы крадзеж, падман; «цяжкія» дзіцячыя пытанні пра Бога, смерць і інш.).

Увядзенне ў адукацыйны стандарт гэтага курса садзейнічае павышэнню якасці навучання будучых выхавальнікаў.